

**ÓБЧЫНСКІ ФАЛЬКЛÓРНЫ ГУРТ «ПАВАЛЯ́КІ»** сельскага Дома культуры Любанскага раёна. Заснаваны ў 1975. Кіраўнік — Н.Верамейчык (з 1994). Працуе ў аўтэнтычнай манеры, якая вызначаецца высокім тэмбрам і адрывістым рытмам. У рэпертуары мясцовы каляндарна-абрадавы (калядкі, шчадроўкі, масленічныя, юраўскія, велікодныя, гукання вясны, жніўныя песні) і пазаабрадавы (любоўныя, жартоўныя, сямейныя і сацыяльна-бытавыя песні, балады, нар. рамансы) песенны фальклор, танцы з прыпеўкамі. Адноўлены абрады Шчадраванне з казой, Провады Масленіцы, Гуканне вясны, Зажынкі і Дажынкі. Калектыў — удзельнік Рэспубліканскага фестывалю сучаснага фальклору «Таўкачыкі» (Мінск, 2004), рэгіянальнага фестывалю «Сугалоссе» (г.п. Старобін Салігорскага раёна, 2001), святкаваннях угодкаў П.Шпілеўскага «Фальклорная вандроўка» (г. Любань, 1993, 1998, 2003). Выступаў у тэлепраграмах «Запрашаем на вячоркі», «Спявай, душа!»

*С.Г.Выскаварка.*

**ÓПАЛЬСКІ НАРÓДНЫ ФАЛЬКЛÓРНА-ЭТНАГРАФІ́ЧНЫ АНСАМБЛЬ «ПАНЁВЫ»** сельскага Дома культуры Іванаўскага раёна. Заснаваны ў 1992, з 1997 народны. Кіраўнік — А.Карповіч. Гурт працуе ў вакальным жанры, спявае а капэла ці пад акампанемент баяна, гармоніка і бубна. У рэпертуары песні палескага рэгіёна («Журавель», «Ходыў до дыўчыны», «А ў полы крынычэнька»), бел. нар. песні («Жыта ў полі», «Забава», «За сонцам не бачу»), бел. кампазітараў Н.Алешкі, В.Карызны, Э.Захлеўнага і інш. Калектыў — лаўрэат Рэспубліканскага фестывалю нар. мастацтва «Беларусь — мая песня» (1998), дыпламант Міжнароднага фестывалю нар. танца «Палескі карагод» (г. Пінск, 1995, 1996), удзельнік Рэспубліканскага свята «Дажынкі» (г. Бяроза, 2001; г. Іванава, 2002). Выступаў у тэлепраграмах «Спявай, душа!», «Запрашаем на вячоркі».

*С.С.Авадок.*

**ОХ**, персанаж *чарадзейных казак* сюжэтнага тыпу СУС 560. Таямнічая істота, якая надзяляе героя чарадзейнымі прадметамі і тым самым дапамагае яму ажаніцца з каралеўнай. У варыянце М.Федароўскага Ох дае герою табакерку, з якой выходзіць чалавек і выконвае ўсе яго жаданні, будуе мост да



***Обчынскі фальклорны гурт «Паваляк»́.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГ